# ПЕРШАЯ ЛЕГАЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАМОЎНАЯ ГАЗЕТА – “НАША ДОЛЯ”

*А.Д. Тогулева*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

У другой палове XIX ст. актывізаваўся працэс фарміравання беларускай нацыі. Гэта было звязана з адменай прыгоннага права ў 1861г. і фарміраваннем буржуазнага грамадства ў Расійскай імперыі. Адной з прыкмет нацыянальнай кансалідацыі з’яўляецца фарміраванне нацыянальнай літаратурнай мовы і ўзнікненне перыядычнага друку на роднай мове этнасу. Мэта працы – вызначыць месца і ролю першай беларускамоўнай легальнай газеты “Наша Доля” ў развіцці беларускага нацыянальнага руху.

**Матэрыял і метады.** Крыніцамі паслужылі дакументы з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ), артыкулы “Нашай Долі”, успаміны дзеячоў БСГ. Рэалізаваны лагічныя метады даследавання, а таксама метады гістарычна-параўнальнага і сістэмнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Цэнтрам беларускага рэвалюцыйнага і культурнага руху ў канцы 1906 г. – 1907 г. стала Вільня. Сюды пераехалі браты Антон і Іван Луцкевічы і менавіта тут разгарнулася выдавецкая дзейнасць беларусаў. Вялікай колькасцю выходзілі беларускія лісткі і брашуры, зборнікі рэвалюцыйных апавяданняў і вершаў. У верасні 1906 г. у Вільні пачала выходзіць першая легальная беларуская газета “Наша Доля”, прызначаная для “вясковага і местачковага рабочага люду”. Газета з’ўлялася органам Беларускай Сацыялістычнай Грамады – першай беларускай нацыянальнай партыі, выходзіла раз на тыдзень рускімі і лацінскімі літарамі, каб яе маглі чытаць і праваслаўныя беларусы і беларусы-каталікі. “Лічачы найбольшым нашым ворагам цямноту і бяспраўнае палажэнне мужыка, – адзначалася ў перадавым артыкуле першага нумару, – мы аб’яўляем вайну ўсім цёмным сілам, каторым дзеля сваёй карысці вялікая выгода была трымаць васьмімільённы народ беларускі ў нядолі і паневерцы, баламуціць і дурыць яго” [1, с. 2].

Рэдакцыя “Нашай Долі” складалася з Ф.Умястоўскага – тэхнічнага рэдактара, Алаізы Пашкевіч і братоў Луцкевічаў [2, с. 418]. Да арганізацыі газеты меў дачыненне А.Уласаў, які прыцягнуў да супрацоўніцтва з ёю Якуба Коласа.

З-за недахопу сродкаў “Наша Доля” была створана не восенню 1905 г. у самы разгар рэвалюцыі, калі народ дабіўся ад урада фактычнай свабоды слова і друку, а толькі праз год, калі па ўсім фронце пачаўся наступ рэакцыі, асабліва моцны ў адносінах да вольнага слова. Як адзначае М. Біч: “Наша Доля” – дзіця няволі, народжанае з пятлёй на шыі. З кожным днём жыцця газеты пятля гэта зацягвалася ўсё мацней” [3, с. 134]. Урадам знішчаюцца апошнія магчымасці прапаганды рэвалюцыі ў 1906 г.

Першы нумар “Нашай Долі” дае магчымасць вызначыць пазіцыю грамадска-палітычных сіл, што стаялі за гэтай газетай. Адкрываецца нумар вершам А. Пашкевіч, надрукаваным пад псеўданімам “Мацея Крапіўкі. “Наш палетак”, які быў прысвечаны тэме нацыянальнага адраджэння беларусаў. І гэта было зусім невыпадкова, што менавіта ён адкрываў першую легальную беларускую газету.

Ф. Умястоўскі, прадстаўнік правага ліберальнага крыла БСГ, які ўваходзіў у склад рэдакцыі, у сваім звароце да чытачоў пісаў: “Дайце беларусу такую кніжку, каб ён зразумеў, што ў ей напісана. Толькі кніжка, напісаная на мове бацькоў яго, патрапіць сноп свету закінуць у цяжкае жыццё беларуса, толькі яна пакажа яму дарогу да лепшае, яснейшае долі!” Кніга, асвета – вось панацэя ад усіх бед, вось крэда ўсіх буржуазных асветнікаў, якога трамалася і ліберальна-буржуазная частка Грамады. Сутнасць іх платформы – культурна-нацыянальнае адраджэнне.

Артыкул “Што будзе” мае выразны антыўрадавы характар. “Правіцельства... не дасць народу ні зямлі, ні праўдзівае свабоды... Асталося яму адно з двух – або так,

як даўней, прападаць з голаду, або самому памысліць аб сваёй долі. І ён выступіў на бой за шчасце ўсёй працавітай беднаты... Цяпер бунтаўшчык – увесь стомільённы цёмны, галодны народ. Але штыкамі і кулакамі можна прыдушыць народ, можна з усяе Расіі зрабіць адну вялікую магілу, а не ўпраўляць жывымі людзьмі...” [4, с. 2]. Артыкул заканчваецца такім вывадам, што ўрад можна скінуць, калі ён не захоча выканаць патрабаванні народа.

Сацыяльна-палітычныя погляды А.Пашкевіч выказаны ў гэтым жа нумары ў адным з лепшых твораў паэтэсы. Гэта верш “Прысяга над крывавымі разорамі”. Ён паказаў, што Цётка ў 1905–1906 гг. стаяла на рэвалюцыйным разуменні сутнасці падзей свайго часу, характару, задач і галоўных сіл рэвалюцыі. У адказ на голас народа: “Вузка! Цесна! Мала!” – “Прысяга” адказвае: “Глядзіце! Во – прасторы! Во – нівы, лясы, палі! Усё гэта – наша!” Галоўнымі героямі гэтага верша з’яўляюцца дворны парабак, салдат і пецярбургскі рабочы – родныя браты, што выйшлі з народа: “Мы дамо! Мы сіла – мы права!” [5, с. 3].

Першы нумар “Нашай Долі” выйшаў у свет 11-тысячным тыражом (палавіна была выдадзена лацінскім шрыфтам) і разыходзіўся надзвычайна хутка: амаль адразу было распрададзена 5 тысяч экзэмпляраў. Як паведамляе М. Біч, за артыкул “Што будзе” і нататку “Даход расейскага цара” афіцыйны выдавец і рэдактар “Нашай Долі” І. Туркеркес быў абвінавачаны па 129-м – самым небяспечным артыкуле крымінальнага ўлажэння, які пагражаў закрыццём газеты і турмой асобе, адказнай за яе выпуск. Але Віленская судовая палата не зацвердзіла распараджэнне адміністрацыі, адмовіла ў закрыцці газеты і адмяніла накладзены на першы нумар арышт [3, с. 35].

У наступных другім і трэцім нумарах “Нашай Долі” быў змешчан артыкул пад назвай “Як мужыку палепшыць сваё жыццё?”, дзе сялянам настойліва раілася выбраць для дасягнення мэты такі ж шлях, на які сталі іх таварышы па працы ў горадзе. “Зрабіць гэту перамену можа толькі ўвесь народ, уся вясковая і мястовая бедната, калі ўсі разам пойдуць па адной дарозе, дзеля чаго ўсе мужыцкія саюзы павінны злучацца праз свае камітэты з рабочымі саюзамі і партыямі ў горадзе” [6, с. 2].

У трэцім нумары “Нашай Долі” быў надрукаваны верш Якуба Коласа “Беларусам”. Гэта было адно з першых выступленняў паэта. У сваім вершы паэт заклікае свай народ да рэвалюцыі, абуджае ў ім веру ва ўласныя сілы, гаворыць аб тым, што новае жыццё ўжо блізка, і трэба апошняе дружнае намаганне – і яно будзе заваёвана [7, с. 2].

Урадавая цэнзура за артыкулы “Старое лякарства”, “Як мужыку палепшыць сваё жыццё?”, “Напасць чужынцаў” і верш “Беларусам” абвінавaціла газету ў замаху на асновы існуючага грамадскага і дзяржаўнага ладу. І як вынік – арышт і канфіскацыя нумару, судовае праследванне афіцыйнага рэдактара [3, с. 137].

У адрозненні ад першых трох, чацвёрты нумар “Нашай Долі” выйшаў ужо пад іншым сцягам, сцягам не рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера, а ліберальна-буржуазнага. Перадавы артыкул гэтага нумару заяўляў, што “зямлю трэба дабываць не сілаю, не грабяжамі, а законам” Гэты буржуазна-ліберальны адказ на самае важнае сацыяльна-эканамічнае і палітычнае пытанне таго часу з’явіўся ў “Нашай Долі” не выпадкова. Восенню 1906 г. палітычныя партыі рэвалюцыйна-дэмакратычнага накірунку, якія актывізавалі сваю дзейнасць у гады рэвалюцыі, увайшлі ў паласу глыбокага крызісу, які ахапіў і Грамаду. Наступленне контррэвалюцыі, пагроза закрыцця газеты, аслабленне левага крыла партыі (А. Бурбіс знаходзіўся ў турме, А. Пашкевіч была вымушана эмігрыраваць) прывялі да таго, што ў гэтым жа чацвёртым нумару рэдакцыя абвясціла аб закрыцці газеты. “Наша Доля”, пакінутая на волю лёсу, маўчала паўтара месяцы. За гэты час згуртаваліся новыя сілы, каб выдаваць газету ў ранейшым рэвалюцыйна-дэмакратычным напрамку.

18 лістапада – 1 снежня 1906 г. пад рэдакцыяй Адама Гедвілы выйшлі два апошнія нумары “Нашай Долі”. У звароце “Да чытацеляў“ былы рэдактар І.Туркеркес паведамляў: “Па прычынах ад мяне не залежных, “Наша Доля” была перастаўшы выходзіць. Шмат прыйшлося цяжкага на долю “Нашай Долі”... Я, крыху аправіўшыся ад усіх бед, што на мяне наваліліся, зноў пачынаю выдаваць “Нашу Долю”, зноў іду служыць беднаму, скрыўджанаму вясковаму і мястоваму рабочаму народу. “Наша Доля” як раней, так і цяпер будзе бараніць справы мужыцкае і ўсёй працавітай беднаты...” [8, арк. 10].

Абодва апошніх нумары “Нашай Долі” былі канфіскаваны. Сёмы нумар паліцыя знішчыла яшчэ ў наборы. М. Біч паведамляе: “Рашэннем Віленскай судовай палаты ад 11 студзеня 1907 г. выданне “Нашай Долі” было забаронена назаўсёды. Царызм па вартасці ацаніў ролю і значэнне першай легальнай беларускай газеты, прызнаўшы ў ёй ворага, які не жадае ісці на кампраміс з ім” [3, с. 138].

З закрыццём “Нашай Долі” заканчваецца і перыяд рэвалюцыйнай дзейнасці прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху. Мясцовыя арганізацыі левых партый у ходзе наступлення контррэвалюцыі і рэакцыі летам і восенню 1907 г. былі амаль паўсюдна разгромлены ці вельмі аслаблены. У гэты час, як зазначаў адзін з актыўных членаў БСГ А. Бурбіс, “арышты і ссылкі руйнуюць беларускія рэвалюцыйныя арганізацыі...” [9, с. 9].

**Заключэнне.** Такім чынам, у выніку фарміравання прыкмет нацыянальнай кансалідацыі беларускага этнасу і наяўнасці дэмакратычных свабод, заваяваных рэвалюцыяй і абвешчаных Маніфестам 17 кастрычніка, у 1906 г. у беларусаў з’явілася першая легальная газета на роднай мове. У склад рэдакцыі уваходзілі славутыя прадстаўнікі беларускага народа, якія імкнуліся адстойваць яго інтарэсы. Але з адступленнем рэвалюцыі і надыходам палітычнай рэакцыі газета “Наша Доля” была закрыта, пакінуўшы значны след у развіцці беларускага нацыянальнага руху.


1. Да чытацеляў // Наша Доля. – 1906. – 1 верасня. – С. 2.
2. Нарысы гісторыі Беларусі: ў 2-х ч. /АН Беларусі ; Ін-т гісторыі.-Мінск : Беларусь, 1994. Ч. 1 / М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў і інш.; пад рэд. М.П. Касцюка. – 440 с.
3. Біч, М. В. У змаганні за лепшую долю / М. В. Біч // Полымя. – 1966. –№ 8. – С.132–138.
4. Што будзе // Наша Доля. – 1906. – 1 верасня. – С. 1–2.
5. Крапіўка, Мацей. Прысяга над крывавымі разорамі / Мацей Крапіўка (Э. Пашкевіч) / Наша Доля. – 1906. – 1 верасня. – С. 3–4.
6. Як мужыку палепшыць свае жыццё? // Наша Доля. – 1906. – № 3. – С. 2.
7. Колас, Якуб. Беларусам / Якуб Колас // Наша Доля. – 1906. – № 3. –С. 2.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 60. Воп. 3. Спр. 74. Арк. 10.
9. Стары Піліп. Кароткі нарыс беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху / Стары Піліп (А. Бурбіс) // Вестник Народного Комиссариата просвещения БССР. – 1921. № 1. – С. 4–9.


## В.И. ЛЕНИН ОБ ОРГАНИЗАЦИИ ОБЩЕСТВЕННОГО КОНТРОЛЯ


*Е.П. Шрамук*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Общественный контроль является проявлением демократии в государственном устройстве, так как предполагает, чаще всего, вовлечение народных масс в управление государством через осуществление наблюдения за законностью проводимых мероприятий. Общественный же контроль предполагает участие членов негосударственных организаций или заинтересованных гражданских лиц в наблюдении за исполнением правовых норм. Система общественного контроля Беларуси является прямым продолжением системы, созданной в СССР в виде Рабоче-крестьянской инспекции (РКИ, Рабкрин). В современной белорусской историографии создание и деятельность РКИ почти не рассмотрены, поэтому представляется целесообразным выявить основы ее создания и функционирования. Цель работы – раскрыть сущность идей В.И. Ленина об общественном контроле.